**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2025 г.

### Мерапрыемствы да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Дня Дзяржаўнага сцяга РБ

**4 мая.** Бібліятэкар філіяла «Акцябрская сельская бібліятэка» расказала школьнікам, колькі гора прынесла вайна нашаму народу, аб цяжкіх выпрабаваннях, стратах і смутку. У ходзе мерапрыемства навучэнцы адказвалі на тэматычныя пытанні, адгадвалі загадкі, выконвалі заданні. Дзеці чыталі ваенныя вершы. Увазе школьнікаў была прадстаўлена выстава «От начала войны до парада Победы», на якой яны змаглі выбраць і ўзяць пачытаць кнігу аб вайне, як памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны.

Філіял «Акцябрская сельская бібліятэка»

**5 мая.** Напярэдадні Дня Перамогі бібліятэка для выхаванцаў дзіцячага дома правяла ўрок патрыятызму «В сердце ты у каждого, Победа». Была аформлена кніжная выстава «Нельга забыць — у імя мірнай будучыні».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**7 мая.** У бібліятэцы прайшоў урок мужнасці «А война была четыре года, долгая была война». Навучэнцы прагледзелі відэаролікі «Начало Великой Отечественной войны», «Брестская крепость».

Філіял «Тэвельская сельская бібліятэка»

**7 мая.** Мерапрыемства адбылося ў рамках сумеснага праекта з Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі «Літаратурны ліхтарык». У якасці госця запрасілі члена СПБ Наталлю Кандрашук, якая прадставіла кнігі, прысвечаныя перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта калектыўныя зборнікі «Гэта наша Памяць», «За Радзімы жыццё!», «Великая Победа – на века!». Паэтэса прачытала свае вершы з гэтых выданняў. Аднак у цэнтры ўвагі была кніга члена СПБ Аляксандра Валковіча «Письма войны», падзагаловак якой гучыць як «Хрестоматия патриотизма». Наталля Кандрашук коратка расказала пра аўтара выдання, зачытала яго словы з інтэрв’ю пра гэтую кнігу і пазнаёміла прысутных са старонкамі, прысвечанымі тым людзям, чыё жыццё або смерць звязана з Кобрыншчынай, больш падрабязна спыніўшыся на гісторыі лётчыка Мікалая Поснікава, які загінуў у небе над вёскай Каташы. Яго лісты на радзіму, а таксама тэксты з «треугольников» іншых франтавікоў зачытвалі школьнікі, а Наталля Кандрашук прадэкламавала верш члена СПБ Георгія

Тамашэвіча, прысвечаны яго загінуламу брату, які таксама размешчаны ў «Письмах войны». Напрыканцы мерапрыемства загадчыца філіяла Кацярына Нясцюк зрабіла агляд выставы, прысвечанай 80-годдзю Вялікай Перамогі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**7 мая.** Бібліятэкар правяла гадзіну памяці «Когда стою я возле Вечного огня» для навучэнцаў сярэдняй школы і азнаёміла з кніжнай выставай «Нельга забыць — у імя мірнай будучыні».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**8 мая.** Да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшоў урок памяці і смутку «Героям павшим слава на века!» і літаратурна-франтавая кампазіцыя «Под салютом Великой Победы!». Мерапрыемства суправаджалася музычнымі творамі ў выкананні вакальнай групы «Фантазия» і вершамі пра вайну.

Установа

**8 мая.** У ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Женщины войны», прымеркаваная да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мерапрыемства, якое адбылося ў рамках праекта «Библиотека без границ», суправаджалася музычнымі кампазіцыямі ў выкананні вакальнай групы «Фантазия».

Установа

**09 мая.** Філіял «Імянінская сельская бібліятэка» сумесна з ДУА «Імянінская сярэдняя школа» правялі гадзіну памяці ля помніка салдатам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Была аформлена кніжная выстава «Расскажет книга о войне» і выстава «Помните их имена», дзе была прадстаўлена інфармацыя аб земляках-ветэранах.

Філіял «Імянінская сельская бібліятэка»

**09 мая.** Філіял «Лукская сельская бібліятэка» сумесна з работнікамі філіяла «Лукскі Дом Культуры» да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне для жыхароў аграгарадка правялі Дзень ваенна-патрыятычнай кнігі «Поклон и память поколений».

Філіял «Лукская сельская бібліятэка»

**13 мая.** У чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшла гадзіна геральдыкі «Государственные символы — национальная гордость» прымеркаваная да Дня Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Гасцямі мерапрыемства сталі жыхары Кобрынскага сацыяльнага пансіяната «Никольский», яны паглядзелі відэаматэрыялы «Символы гордости, чести и

славы», пасля чаго адказалі на пытанні віктарыны «Наши главные символы». Вакальная група «Фантазия» падрыхтавала музычнае суправаджэнне.

Установа

**14 мая.** Бібліятэка правяла літаратурна-музычную кампазіцыю «И пусть поколения помнят» і паказала відэаролікі «Священная война», «Брестская крепость», «Беларусь помнит» для навучэнцаў Арэхаўскай сярэдняй школы.

Філіял «Арэхаўская сельская бібліятэка»

**14 мая.** У бібліятэцы прайшла гадзіна памяці «Войной испепелённые года» да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мерапрыемства завяршылася аглядам новых кніг па генацыдзе беларускага народа і кніжнай выставы, прысвечанай 80-годдзю Вялікай Перамогі.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**14 мая.** У чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшоў урок мужнасці «Мы — наследники той Победы» ў рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі». Вакальная група «Фантазия» падрыхтавала музычнае суправаджэнне.

Установа

## Іншыя мерапрыемствы

**2 мая.** У чытальнай зале прайшоў практыкум «Время креативного библиотекаря: от предложений — к творческим инициативам», удзельнікамі якога сталі супрацоўнікі філіялаў ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». Былі падведзены вынікі раённага конкурсу кніжных выстаў, прысвечаных 80 — годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне «Страницы книг — история войны». Пераможцы вызначаны па наступных намінацыях: «Выставка-инсталляция», «Выставка-историко-краеведческая», «Выставка-панорама», «Выставка-минимализм». А пазітыўны імідж бібліятэкі разабралі на майстар-класе «Социальные сети от А до Читателя».

Установа

**16 мая.** У рамках Міжнароднага дня сям'і ў чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшла гадзіна духоўнай асветы «Свет отчего дома» і літаратурна-музычная духоўная гадзіна «Венец всех ценностей — семья». Мерапрыемствы прайшлі пры ўдзеле свяшчэнніка храма свяціцеля Мікалая Цудатворца горада Кобрына іерэя Мікалая Качуркі, урача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святланы Васільевай, урача па медыцынскай прафілактыцы цэнтра, дружалюбнага падлеткам і моладзі «Ориентир» Вольгі Філіпені, урача

рэпрадуктолага Кобрынскай ЦРБ Таццяны Праташчык. Вакальная група «Фантазия» падрыхтавала музычныя нумары.

Установа

**16 мая.** Да Міжнароднага Дня памяці людзей, якія памерлі ад СНІДу, у чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшоў урок здароўя «Береги себя для жизни» у рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта «Здоровая молодёжь — здоровая нация» для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. У якасці госця запрасілі урача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святлану Васільеву. Наталля Раманюк выканала прысутным музычную кампазіцыю «Жизнь продолжается»

Установа

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81